Твор страчвае свой гуманістычны сэнс, калі ў ім няма маральнага і псіхалагічнага апраўдання самога факта прыцягнення дзяцей да ваенных дзеянняў. Нават у Гайдара ў вядомай казцы пра Мальчыша-Кібальчыша малышы ўступаюць у смяротны бой з праклятымі буржуінамі толькі таму, што абставіны абавязваюць: «І бацькі пайшлі, і браты пайшлі – нікога не засталося. Стары стогадовы дзед – не баец. Ён не можа падняць вінтоўкі. А байцам, што чакалі дапамогі, – толькі б ноч прастаяць ды дзень пратрымацца».

Трэба адзначыць, што абвостраная цікавасць да дзіцячых лёсаў на вайне гаворыць аб паглыбленні гуманістычнага пафасу ў літаратуры. Тэма ўкрадзенага вайной дзяцінства набыла трагічнае гучанне і філасофскі сэнс.

***Літаратура***


1. Васючэнка, П. Пошукі страчанага дзяцінства / П. Васючэнка. – Мінск, 1995.
2. Гуревич, Э. Из поколения «подранков»: Современная белорусская проза для детей о войне / Э. Гуревич // Детская литература. – 1988. – № 5. – С. 14–17.
3. Купала, Я. Збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск, 2003. – Т. 9.
4. Шолохов, М. Собр. соч: в 9 т. / М. Шолохов. – М., 1969. – Т. 8.



*І.М. Гоўзіч (Мінск, БДПУ)*


## ТВОРЧАСЦЬ МАКСІМА ТАНКА: ЭТЫКА-ФІЛАСОФСКІЯ АРЫЕНЦІРЫ

XX ст. прайшло пад знакам няспынных эксперыментаў у слоўным мастацтве, перш за ўсё ў лірыцы (сімвалісты, футурысты, акмеісты, імажыністы, за імі мадэрністы і постмадэрністы). Рабіліся нават актыўныя спробы стварэння «навуковай паэзіі» як апанента пачуццёвай словатворчасці, эмацыянальнасці – найважнейшага кампанента, нязменнага складніка мастацка-вобразнага мыслення. Вынікам барацьбы і ўзаемадзеяння дзвюх тэндэнцый у мастацтве слова і сталася лірыка М. Багдановіча, А. Куляшова, М. Танка, Я. Сіпакова, А. Вярцінскага, А. Разанава ды іншых аўтараў. Іх слоўная творчасць адметная сінтэзам думкі і пачуцця, адзінствам канкрэтнага і абстрактнага. «Аб'ектывізм» выяўленчасці і апісальнасці дапаўняецца ў падобнай паэзіі разважлівасцю, роздумам, а пачуццёвы пачатак падпарадкоўваецца разумоваму, набывае выразныя абрысы, бярэцца ў берагі разважлівасці, мэтазгоднай прастаты і сіметрыі. Як у «Новай кнізе», «Хуткасці», у вершы А. Куляшова, што даў назву другому зборніку: Ёсць хуткасць гуку, ёсць – звышгукавая, // Ёсць хуткасць зор, прыкметная для ўсіх. // Яшчэ ёсць хуткасць думкі, хуткасць тая, // Што, як святло, стагоддзе абганяе, // З тысячагоддзем размаўляе ўслых. // О, таямніца кніг, скажы, з якіх // Людскіх глыбінь ты цуда здабывала? [1, с. 5].

Такім чынам, А. Куляшоў больш давярае думцы, чым пачуццю, стварае своеасаблівы культ яе, імкнецца пераступіць за мяжу пачуццёвага. Але аўра пачуццёвага пафасу застаецца: лірычны герой страсна перажывае такую сітуацыю, пры якой мастак аказваецца абмежаваны ў сваіх магчымасцях пазнання сакрэтаў жыцця і перадачы іх з дапамогай слова (у А. Куляшова яшчэ з аднаго кавалака верша «Хуткасць» гэта асабліва вынікае): «Твой зачынальнік слоў не знаў і мала // Свет разумеў, не меў матык і сох, // Маўчаў, як сом, пакуль бяда не ўзяла // За шчэлепы яго і на пясок // Не кінула, пакуль сярод начы // Яго душы нямой, сканаць гатовай, // Не загадала: – Дыхай, плач, крычы, // Нябыт цяжкі пазбудзь не рыб'яй мовай!» [1, с. 6].

Працэс паэтызацыі разгортвання думкі ў філасофскай лірыцы А. Куляшова (як і яго папярэдніка М. Багдановіча, аўтара крылатых радкоў «Жыві і цэльнасці шукай, // Аб шыраце духоўнай дбай», паплечнікамі М. Танкам, А. Русецкім, С. Дзяргаем) не завяршыўся. Цяпер склаўся варыянт творчасці, у якой адбываецца як агульная актывізацыя мысліцельнай энергіі, так і канцэнтрацыя пачуцця, дзякуючы яскравай выяўленчасці, трапнасці мастацкіх дэталей і ўдала знойдзеным слоўна-выяўленчым сродкам, што, да прыкладу, відаць з наступных цытатах з тэкстаў П. Элюара, Я. Баратынскага, А. Куляшова: «Я скінуў лёд з рук сплеценых маіх! // Я выкінуў шкілет свайго жадання»; «Но пред тобой, как пред нагим мечом, // Мысль, острый луч! // Бледнеет жизнь земная»; «Маўчаў, як сом, пакуль бяда не ўзяла // За шчэлепы яго…».

У пачатку XX ст. канчаткова выпрацаваліся традыцыі выяўленча-медытатыўнага варыянта паэзіі думкі ў многіх літаратурах свету, асабліва ў нашай нацыянальнай літаратуры. Дарэчы, вытокі падобнай паэзіі бачацца нам не толькі ў антычным мастацтве слова, але і ва ўсходнім, у якім даўно замацаваліся традыцыі разважальнасці, афарыстычнасці ў спалучэнні з экзатычнасцю і арнаментальнасцю. Сведчаннем выказанага тэзісу могуць быць творы такіх паэтаў, як Абу-ль-Ала аль-Маары (973–1057), Амар Хаям (каля 1048 – каля 1123) – аўтар чатырохрадкоўяў – рубайі, Румі – аўтар прытчаў «Селянін і леў», «Прытча пра садоўніка», «Прытча пра вінаград», «Спрэчка пра слана», аўтар газэляў і чатырохрадкоўяў Саадзі (1212–1292), Хафіз (1325–1389), Джамі (1414–1492). У творах названых паэтаў думка аголеная, эталагічны пачатак не завуаліраваны, а прытчападобнасць – вызначальная, да прыкладу: «Много лет размышлял я над жизнью земной.// Непонятного нет для меня под луной. // Мне известно, что мне ничего не известно! – // Вот последняя правда, открытая мной» [2, с. 133].

Сярод паэтаў-філосафаў Беларусі адно з першых месц належыць Максіму Танку, які адрозніваецца ад А. Куляшова больш яскравым імкненнем засвоіць традыцыі сусветнай літаратуры (верлібр, паглыбленая асацыятыўная вобразнасць), разбурыць класічныя каноны, надаць вершам большую прытчападобнасць. Яго філасофская лірыка ўяўляе сабой вышэйшы этап руху мастацкай творчасці беларусаў да інтэлектуалізацыі, пераразмервання суадносін паміж «рацыё» і «эмоцыё». Пачуццё ў многіх творах паэта 1980–1990 гг. выяўляецца стрымана, строга і стройна, «падтэкстава»: // Лістаю рэшткі дзённіка, // Якога многія старонкі // То пашматаў // Прапахлы порахам і дымам вецер, // То пайшлі на самакруткі, // То на распал // Суркоўскай франтавой пячуркі… // Хоць ведаю, што іх не аднавіць, // Працягваю блукаць // Па сваіх снах, // Па замініраваных сцежках // Успамінаў [3, с. 78].

Максім Танк арыентуецца на павучальнасць, эталагізм не толькі «ўнутранага», але і «знешняга» парадку: форма яго твораў падпарадкоўваецца доказнасці і набывае лагічную стройнасць і строгасць. Многія вершы паэта ўяўляюць сабою разгорнутыя разважанні з самім сабой і з апанентамі, суразмоўцамі – зямлёй і небам, сонцам і зорамі, дрэвамі і рачнымі хвалямі, звярамі і птушкамі і – вядома – людзьмі. Размеранасць, гутарковасць – адметнасць эталагічнай разнавіднасці філасофскай лірыкі, якую прадстаўляюць М. Танк, А. Вярцінскі, у пэўнай ступені П. Панчанка.

Новае, больш шырокае гучанне ў творчасці паэтаў атрымлівае зараз адраджэнская тэматыка, якая становіцца дамінантнай у многіх вершах Пімена Панчанкі, Максіма Танка, Ніла Плевіча, Васіля Зуёнка, Генадзя Бураўкіна, Сяргея Законнікава. Паэты ствараюць мастацкі свет, у цэнтры якога стаіць чалавек-мысліцель, філосаф, палітык, публіцыст,

грамадзянін, які клапоціцца пра лёс Бацькаўшчыны. Узмацненне грамадзянскай скіраванасці сучаснай беларускай паэзіі звязана з трывожным станам у адносінах да роднай мовы, занядбаннем нацыянальных традыцый напрыканцы XX – у пачатку XXI ст.

Амаль кожны верш Максіма Танка 80–90-х гг. XX ст. насычаны медытатыўнасцю, псіхалагізмам з абавязковым выхадам з лакальнага перажывання і асабістага пачуцця на ўсеагульны драматызм і ўніверсальную трывогу за свет з адзнакамі філасафізму і псіхалагізму. Кожны твор паэта становіцца своеасаблівай драмай у вершах. Таму часта лірычны герой адчувае ці прадчувае сваё «выпадзенне» з часу, яму думаецца, што ён рухаецца нейнагу з гістарычнымі падзеямі. Так нараджаюцца вершы-рэквіемы, своеасаблівыя элегіі смерці пра новы Апакаліпсіс – Чарнобыль («Тут Беларусь была», «З новага Апакаліпсіса» і інш.): «Забойчая пошасць Чарнобыля // Асіраціла хаціну, // І дзверы забіла, і вокны // Заткала бяльмом павуціны. // Смяротны яе подых чуецца // У чалесніку печы счарнелай, // У гушкалцы-люльцы дзіцячай, // Што стала апошняй пасцеляй. // <...> І хоць сонца свеціць, як некалі, // Але ўсё ў душы ледзянее, // Цярністым вянком на хаціне // Пустая бусляня чарнее» [4, с. 33].

Максім Танк у падобных вершах звяртаецца да біблейскай тэматыкі, да запаведзяў, што пакінуў нам Бог: «Здавалася, што на ўсё жыццё хопіць// У мяне расплачвацца:// За дабро – дабром, // За забыццё – памяццю,// За абыякавасць – цеплынёй, // За жорсткасць – ласкай» [4, с. 120]. Асабліва ў апошнія гады свайго жыцця ён успамінае даўнія запаветы, якія выпрацаваліся і сфарміраваліся пад уплывам агульначалавечай маралі, прайшлі выпрабаванне часам і карэктавапіся свядомасцю на новай вышыні: «З даўніх запаведзяў сёння // Паўтараю я нязменна: // Ратуй, божа, ад вар'яцтва // Нематы і засляплення, // Ад пярэваратняў, злыдняў, // Ханжаскіх богаслужэнняў, // Пошасці, вайны, бясхлеб'я, // Нашых душ апусташэння» [4, с. 27].

М. Танк – яркі прадстаўнік «паэзіі думкі», творчасць якога сведчыць пра разнастайнасць сучаснай беларускай лірыкі, яе арыентацыю на здабыткі сусветнай літаратуры, пра тое, што яна носіць выяўленча-апісальны, эталагічны і медытатыўны (філасофскі) характар.

***Літаратура***


1. Куляшоў, А. Хуткасць / А. Куляшоў. – Мінск, 1976.
2. Лирики Востока. – М., 1986.
3. Танк Максім. Збор твораў: у 4 т. / Максім Танк. – Мінск, 1967. – Т. IV: Вершы, дзённікі, пераклады.
4. Танк Максім. Errata: Вершы. Пераклады / Максім Танк. – Мінск, 1996.



***Т.К. Грамадчанка ( Мінск, БДПУ)***


## ІНТЭРТЭКСТУАЛЬНАСЦЬ У ЛІРЫЦЫ МАКСІМА ТАНКА

Паняцце *інтэртэкстуальнасць* ключавое ў постмадэрнісцкай паэтыцы, аўтары якой зыходзяць з уяўлення, што літаратура, культура і, шырэй, уся рэчаіснасць – могуць быць прачытаны як адзіны тэкст. Пад інтэртэкстуальнасцю разумеецца выяўленая з дапамогай разнастайных прыёмаў сувязь з іншымі творамі. Да такіх прыёмаў адносяць эпіграф, пародыю, перыфраз, цытаванне, выкарыстанне крылатых слоў і выразаў, вядомых з літаратурных узораў, і г. д. Любыя інтэртэкстуальныя адносіны будуюцца на ўзаема-